Беларусь.info

№11 16/03/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**ЗША уключылі Беларусь у спіс сямі “дэспатычных сістэм” свету.** У гэты спіс увайшлі Беларусь, Іран, КНДР, Сірыя, Куба, Бірма і Зімбабве.

**КДБ пагражае мірным дэманстрантам смяротнай карай.** На прэсканферэнцыі кіраўнік КДБ С. Сухарэнка сказаў, што ўсіх хто выйдзе на дэманстрацыю будуць судзіць як тэрарыстаў. Гэты артыкул прадугледжвае ад 8 да 27 гадоў турмы або пакаранне смерцю.

**"Вольны горад" застаўся без кампутараў.** Арыштавана аргтэхніка і ўчыненыператрус у рэдакцыі незалежнай крычаўскай газэты “Вольны горад”.

**Старшыня ЦВК Беларусі Лідзія Ярмошына прагаласавала ў другі дзень датэрміновага галасаваньня.** Свой учынак яна патлумачыла так: "У мяне папросту ня будзе магчымасьці прыехаць і прагаласаваць. А я хацела б аддаць свой голас. Думаю, уся мая сям’я будзе галасаваць датэрмінова. Бо ва ўсіх ёсьць свае пляны. Сын працуе ў пракуратуры, і, мабыць, будзе дзяжурыць у гэты дзень. Таму — мяркую — мы ўсе будзем галасаваць датэрмінова: гэтак вымушаюць акалічнасьці працы".

# Людзі

**Вацлаў Гавел і Лех Валенса: “Мілінкевіч здольны прывесці Беларусь да дэмакратыі”.** Вацлаў Гавел і Лех Валенса выказалі падтрымку Аляксандру Мілінкевічу і аб’яднаным дэмакратычным сілам у Беларусі. Сёння вядучыя чэшскія і польскія выданні апублікавалі артыкул двух прэзідэнтаў пад назвай “Чаму Аляксандр Лукашэнка прайграе”. Прапаноўваем тэкст Вашай увазе.

# Цытаты

**Анатоль Лябедзька лічыць, што беларускім сілавікам патрэбная дапамога псіхіятараў:** "Сухоренко надо бояться не оппонентов режима, а прихода к нему санитаров психбольницы. Потому что его заявление - за гранью здравого смысла. У меня такое ощущение, что попытка гоняться за призраком заговора привела к тому, что у части «верхушки» просто возникло психическое расстройство".

# Абвесткі

**18 сакавіка на плошчы Бангалор адбудзецца канцэрт-сутсрэча з Мілінкевічам.** Мінгарвыканкам даў афіцыйны дазвол на вялікі канцэрт, які пачнецца ў 17:00 18-га сакавіка. На канцэрце выступяць знаныя беларускія гурты і праекты — N.R.M., Нейро Дзюбель, IQ-48, Партызанская школа. Магчымы ўдзел іншых камандаў.

**Вазьміце 19-га з сабой на плошчу паветраныя шарыкі.**